16. *Собаль В. Е., Тарасаў С. В.* Абутак сярэдневяковага Мінска // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. Мінск, 1985. № 4. С. 34–36.
17. *Тарасаў С. В.* Арнаменты мінскіх чаравікаў // Мастацтва Беларусі. Мінск, 1985. № 12. С. 70–71.
18. *Тарасов С. В.* Технология и инструменты кожевенно-сапожного ремесла Полоцка и Минска (XI–XVIII вв.) // Памятники науки и техники 1987–1988 гг. Минск, 1989. С. 164–175.
19. *Лысенко П. Ф.* Города Туровской земли. Минск, 1974.
20. *Лысенко П. Ф.* Туровская земля IX–XIII вв. Минск, 1999.
21. *Лысенко П. Ф.* Древний Туров. Минск, 2004.
22. *Лысенко П. Ф.* Берестье. Минск, 1985.
23. *Курбатов А. В.* Кожевенное ремесло в средневековой России : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.00.06. СПб., 2012.
24. *Курбатов А. В.* Опыт исторической интерпретации изделий кожевенно-обувного производства // Древний Псков. Исследования средневекового города. СПб., 1994. С. 86–90.
25. *Курбатов А. В.* Уровень технологии кожевенного ремесла в древнерусский период // Ладога и Северная Европа. СПб., 1996. С. 81–83.
26. *Курбатов А. В.* Новгородская «революция XII века» и прогресс в кожевенном ремесле // У истоков русской государственности. СПб., 2007. С. 89–127.
27. *Осипов Д. О.* Кожаная обувь: информационные возможности археологических коллекций (по материалам раскопок в Москве) // Рос. археология. М., 2003. № 2. С. 17–30.
28. *Осипов Д. О.* Обувь Московской земли XII–XVIII вв. // Материалы охранных археологических исследований. М., 2006. Т. 7.
29. *Wiklak H.* Oduvie gdanskie z XIII–XIV wieku // Gdansk wczesnosredniowieczny. Gdansk, 1967. T. 6. S. 137–179.
30. *Wiklak H.* Polskie obuwie wczesnosredniowieczne z VIII–XIII w. na podstawie wykopalisk // Materialy Wczesnosredniowieczne. Wroclaw ; Warszawa ; Krakow, 1969. T. 6. S. 475–516.
31. *Wojtasik J.* Wczesnosredniowieczne wyroby ze skory znalezione na stanowisku 4 w Wolinie // Materialy Zachodnio-Pomorskie. Szczecin, 1960. T. 6. S. 159–208.
32. *Grew F., de Neergaard M.* Shoes and pattens // Medieval finds from excavations in London. London, 1988.

Паступіў у рэдакцыю 16.04.2015.

***Кацярына Андрэеўна Пярфільева*** – аспірантка кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ. Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, загадчык кафедры спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта А. А. Егарэйчанка.

*УДК 329.78(476)(091)«18/19»*

*В. А. ВЯРЫГА*

## ВУЧНЁЎСКАЯ МОЛАДЗЬ У ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ У КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

Посвящена общественно-политическому движению учащейся молодежи на территории белорусских губерний в конце XIX – начале XX в. Показана роль учащейся молодежи в общественно-политической жизни на территории белорусских губерний в конце XIX – начале XX в. Отмечается, что на политическую активность ученической молодежи оказывали влияние социалистические политические партии, этническое, религиозное дифференцирование молодежи, развитие системы образования. Определены этапы в развитии молодежного движения с конца XIX в. до 1914 г. Отмечается, что в конце XIX в. – 1904 г. происходит процесс становления и развертывания ученического движения. Подчеркивается, что наибольшего подъема общественно-политическая деятельность учащейся молодежи достигла во время революции 1905–1907 гг., что в значительной степени было обусловлено влиянием социалистических партий. Анализируется деятельность учащихся с июня 1907 по август 1914 г. Делается вывод о том, что учащаяся молодежь принимала активное участие в политической жизни белорусских губерний, что заставляло власти пристально контролировать ее.

***Ключевые слова:*** молодежь; учащиеся; общественно-политическая жизнь; белорусские губернии.

The article is devoted to the social and political movement of student youth on the territory of Belarusian provinces in the late XIX – early XX centuries. The purpose of the arcticle describes the role of student youth in the political life of the territory of Belarusian provinces in late XIX – early XX centuries. This item shows that the political activity of student youth was under the influence of the socialist political parties, ethnic, religious differentiation of the younger generation and the development of the education system. Also, there is determination of the steps in the development of the youth movement in the late XIX century – 1914. It finds that at the end of the XIX century – 1904 was a process and development of student movement. This theme emphasizes that the socio-political activity of student youth has reached the greatest rise during the revolution of 1905–1907 due to the influence of the socialist parties. The activity of students from June 1907 to August was took an active part in the political life of the Belarusian provinces, that made authorities to control it too much.

***Key words:*** youth; pupils; social and political life; the Belarusian provinces.

Сярод усіх маладзёжных груп вучнёўская моладзь прымала самы актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці беларускіх губерняў у канцы XIX – пачатку XX ст. Разам з тым пытанне, ці павінна навучэнская моладзь прымаць удзел у палітычным жыцці краіны, з'яўляецца важным і актуальным, прыцягваючым увагу многіх даследчыкаў у розныя часы.

Зразумела, што актыўны ўдзел моладзі ў грамадска-палітычным жыцці беларускіх губерняў – гэта не выпадковасць. Вызначым шэраг фактараў, якія тым або іншым чынам уплывалі на палітычную актыўнасць беларускай моладзі.

П а - п е р ш а е, у другой палове XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі беларускіх губерняў актыўна развівалася сістэма народнай адукацыі, у асноўным у выглядзе пачатковых школ і сярэдніх навучальных устаноў.

Усяго ў беларускіх губернях налічвалася 76 934 чал., якія мелі адукацыю вышэй за пачатковую, што складала 4,1 % ад колькасці мясцовага пісьменнага насельніцтва. Перапісам 1897 г.

у беларускіх губернях таксама зарэгістравана 43,8 тыс. мужчын і 22,7 тыс. жанчын, якія атрымалі адукацыю ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах. Разам яны складалі каля 0,8 % ад агульнай колькасці насельніцтва беларускіх губерняў. Для параўнання: у Расійскай імперыі гэты паказчык складаў 1,1 % [1, с. 76–77].

Адзначым, што з-за адсутнасці на тэрыторыі беларускіх губерняў вышэйшых навучальных устаноў цэнтрамі найбольшай палітычнай актыўнасці былі сярэднія навучальныя ўстановы: вучылішчы, семінарыі, гімназіі, настаўніцкія інстытуты.

П а - д р у г о е, на развіццё вучнёўскага руху ў беларускіх губернях уплывала дыферэнцаванасць яго ўдзельнікаў па сацыяльным паходжанні, этнаканфесіянальнай, палітычнай прыметах. Гэта ў выніку не спрыяла еднасці вучнёўскай моладзі, а выклікала яе дзяленне на пэўныя групы са сваімі мэтамі і задачамі.

П а - т р э ц я е, сярод вучнёўскай моладзі былі вельмі папулярныя сацыялістычныя ідэі, якія актыўна распаўсюджвалі рэвалюцыйна-дэмакратычныя партыі, праводзячы сярод моладзі агітацыйна-прапагандысцкую работу. Значна ўплывалі на навучэнцаў такія партыі, як Бунд, РСДРП, ПСР, БСГ, ППС і інш. Дададзім таксама, што агітацыйная дзейнасць палітычных партый іншых плыняў амаль не аказвала свайго ўплыву на вучнёўскую моладзь беларускіх губерняў.

П а - ч а ц в ё р т а е, сярод усіх сацыяльных слаёў і пластоў насельніцтва найбольшай палітычнай актыўнасцю адрозніваліся вучні – выхадцы са шляхецкіх сямей, а таксама моладзь яўрэйскага паходжання. Яўрэйская вучнёўская моладзь праяўляла значную палітычную актыўнасць, што было звязана з тымі сацыяльна-эканамічнымі і грамадска-палітычнымі абмежаваннямі, якія існавалі ў Расійскай імперыі ў адносінах да яўрэяў: пражыванне ў мяжы яўрэйскай аселасці, забарона пражываць у сельскай мясцовасці і інш.

У гісторыі маладзёжнага вучнёўскага руху на тэрыторыі беларускіх губерняў з канца XIX ст. да пачатку Першай сусветнай вайны ў жніўні 1914 г. умоўна можна выдзеліць некалькі перыядаў:

1) канец XIX ст. – снежань 1904 г.;
2) студзень 1905 г. – май 1907 г.;
3) чэрвень 1907 г. – жнівень 1914 г.

Падчас першага перыяду назіраецца станаўленне і шырокае разгортванне вучнёўскага руху на тэрыторыі беларускіх губерняў. Гэтаму спрыялі хуткае развіццё рэвалюцыйнага руху па ўсёй краіне і, канечне, актыўная агітацыйна-прапагандысцкая дзейнасць сярод моладзі партый сацыялістычнай арыентацыі, такіх як Бунд, РСДРП, ПСР, ППС і інш. Але пры наяўнасці ў прадстаўнікоў маладзёжных арганізацый палітычных патрабаванняў перавага ўсё ж была на баку акадэмічных (звязаных з вучэбным працэсам).

Ужо ў канцы XIX – пачатку XX ст. амаль у кожнай вучэбнай установе была свая вучнёўская арганізацыя. Яны былі рознымі па памерах. Некаторыя з іх аб'ядноўвалі невялікую колькасць навучэнцаў. Аднак былі і такія, што мелі складаны ўнутраны падзел. Напрыклад, Дзвінская арганізацыя навучэнцаў, у склад якой уваходзілі прадстаўнікі розных навучальных устаноў г. Дзвінска, у пачатку XX ст. мела структуру, прадстаўленую кіруючым цэнтрам, прапагандысцкай, агітацыйнай, тэхнічнай, арганізатарскай групамі [2, с. 31]. Кожная з гэтых структурных падраздзяленняў выконвала свае абавязкі.

Грамадска-палітычная актыўнасць вучняў у канцы XIX – пачатку XX ст. яшчэ не выклікала вялікай занепакоенасці збоку адміністрацый вучэбных устаноў, часта яны замоўчвалі наяўнасць палітычных рухаў у сценах устаноў адукацыі, баючыся гневу вышэйстаячых улад. Так, у справаздачы аб дзейнасці Віленскай другой гімназіі падкрэслівалася, што паводзіны вучняў у 1896/97 навучальным годзе былі даволі прыстойнымі. Вышэйшыя адзнакі ў сярэднім за абодва паўгоддзі атрымалі па паводзінах да 96 % ад агульнай колькасці вучняў. Мерамі да выпраўлення вучняў, якія праяўлялі схільнасць да парушэння правіл школьнага парадку і дысцыпліны, служылі пераважна спосабы маральнага ўздзеяння, у выпадку патрэбы ўжываліся таксама і адпаведныя дысцыплінарныя спагнанні [3, с. 11], аднак яны прымаліся вельмі рэдка.

Разам з тым улады ўсё ж усведамлялі небяспечнасць магчымага развіцця маладзёжнага руху. Сярод мер, якія павінны былі не дапусціць гэтага, улады бачылі наступныя: узмацненне кантролю за навучэнцамі, пашырэнне ролі педагагічнага савета, адказнасць бацькоў навучэнцаў і інш. Адлічэнне выкарыстоўвалася ў крайніх выпадках. Звесткі аб найбольш палітычна актыўных навучэнцах, асабліва тых, хто ўжо скампраментаваў сябе сувяззю з той або іншай недазволенай партыяй, удзельнічаў у забароненым мітынгу, забастоўцы, нелегальным сходзе, або аб наяўнасці нелегальнай літаратуры, агітацыйных лістовак перадаваліся кіраўніку вучэбнай акругі, прадстаўнікам паліцыі і жандармерыі. Акрамя таго, лічылася неабходным палепшыць якасць самога адукацыйнага працэсу і працы выкладчыкаў, бо, па меркаванні ўлад, навучэнцы, не атрымліваючы нагрузкі ў час вучобы, маюць шмат вольнага часу і выкарыстоўваюць яго ў благіх намерах.

Тым не менш вучнёўская моладзь прыняла актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху 1905–1907 гг. на тэрыторыі беларускіх губерняў. Розныя па памерах выступленні адбываліся амаль у кожнай значнай вучэбнай установе.

У гэты час маладыя людзі выказвалі палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і акадэмічныя патрабаванні. У большасці выпадкаў вучнёўская моладзь, не маючы ўласнай і адзінай праграмы дзеянняў, прымала ўдзел у мітынгах, забастоўках, сходах, займалася распаўсюджваннем агітацыйнай літаратуры тых або іншых палітычных партый.

Асабліва значны ўздым грамадска-палітычнай актыўнасці вучнёўскай моладзі наглядаўся ў студзені – лютым і кастрычніку 1905 г. У гэты час хваляванні адбываліся практычна ў кожнай значнай навучальнай установе на тэрыторыі беларускіх губерняў. Яскравым прыкладам могуць служыць хваляванні сярод навучэнцаў г. Мінска. Тут на ўздыме рэвалюцыйнага ўзбуджэння навучэнцы Мінскай духоўнай семінарыі ўчынілі пагром у кватэры рэктара семінарыі, сапсавалі мэблю, раскідалі дакументы. З кватэры рэктара натоўп да 100 чал. накіраваўся ў кватэру інспектара, дзе адбыўся такі ж пагром [4, с. 600].

Значныя хваляванні навучэнцаў у лютым 1905 г. адбываліся таксама ў Слуцкай гімназіі (19 лютага), Пінскім рэальным вучылішчы (22 лютага) і інш. [5, с. 598–599].

Новы ўздым грамадска-палітычнага руху вучняў назіраўся ў кастрычніку 1905 г. Выступленні вучнёўскай моладзі адбываліся ў Аршанскай, Ковенскай, Магілёўскай, Слуцкай, Мінскай, Гродзенскай і іншых гімназіях.

Навучэнцы адзначанай Мінскай гімназіі таксама прымалі актыўны ўдзел у сумнавядомай дэманстрацыі на прывакзальнай плошчы 18 кастрычніка 1905 г. За ўдзел у дэманстрацыі і некаторых іншых рэвалюцыйных акцыях кіраўніцтва гімназіі планавала выключыць шэраг навучэнцаў. Аднак навучэнцы не супакоіліся і нават падрыхтавалі дырэктару Мінскай гімназіі ліст ад 19 кастрычніка 1905 г., на наступны дзень пасля Курлаўскага расстрэлу, у якім гаварылася аб садзеянні дырэктара таму, «каб ніхто з нашых таварышаў ня быў выключаны, так як мы не дапусцім гэтага, не спынімся ні перад якімі карамі, нават перад кровапраліццем. Ведайце, што за нас ідуць працоўныя і кроў наша ўпадзе на Вашу галаву» [6, арк. 10]. Але выключаныя ўсё ж былі.

Такія радыкальныя звароты навучэнцаў да кіраўніцтва вучэбных устаноў на тэрыторыі беларускіх губерняў былі хутчэй выключэннямі на хвалі рэвалюцыйных падзей 1905 г., чым практыкай. Па меншай меры 5 вучняў і вучаніц, па даным мінскага паліцмайстра, пацярпелі падчас мітынгу 18 кастрычніка ў Мінску каля чыгуначнага вакзала [7, арк. 12].

Адбываліся сходы і палітычныя выступленні навучэнцаў і ў 1906, і ў 1907 гг. Напрыклад, 16 сакавіка 1906 г. былі хваляванні сярод вучняў Слуцкай гімназіі: навучэнцы арганізавалі дэманстрацыю, прыпынілі заняткі, спявалі рэвалюцыйныя песні [8, с. 602]. У кастрычніку 1906 г. адбылося выступленне навучэнцаў Бабруйскай мужчынскай гімназіі, падчас якога на сходцы спяваліся рэвалюцыйныя песні [9, с. 602]. 24 лютага 1907 г. у Мінску ў хаце мяшчанкі Левінай паліцыя затрымала каля 50 чал. падчас незаконнай сходкі навучэнцаў мясцовых навучальных устаноў [10, с. 603].

Звычайна выступленні вучнёўскай моладзі беларускіх губерняў падчас рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. праходзілі больш спакойна, чым у цэнтральных і індустрыяльна развітых рэгіёнах імперыі. Хаця часам выступленні мясцовых навучэнцаў усё ж набывалі радыкальны характар. Так, напрыклад, падчас дэманстрацыі ў Магілёве 23 студзеня 1905 г., арганізаванай тымі ж гімназістамі, рэалістамі і вучнямі фельчарскай школы, пры спробе паліцыі затрымаць яе ўдзельнікаў адбылася перастрэлка, ранены 4 чал., у тым ліку і гарадавы [11, с. 24].

Былі выпадкі, калі грамадска-палітычная актыўнасць мясцовай моладзі прыводзіла да таго, што на яе супакаенне не хапала моцы мясцовай паліцыі, што патрабавала высылкі на месцы хвалявання дадатковых сіл. Так, да прыкладу, у ліпені 1905 г. у Горках (Магілёўская губерня) прыйшлося размяшчаць пяхотную роту з-за таго, што навучэнцы горацкіх вучэбных устаноў разам з яўрэйскай моладдзю, карыстаючыся малалікасцю паліцыі, паралізавалі яе дзейнасць [11, с. 24].

Падчас другога перыяду ажыццяўлялася спроба стварыць прафесійны хаўрус навучэнцаў настаўніцкіх семінарый. 19 красавіка 1906 г. у Маладзечне падчас афіцыйнай вечарыны адбылася сустрэча прадстаўнікоў настаўніцкіх семінарый. На ёй абмяркоўваліся пытанні стварэння свайго вучнёўскага саюзу, адміністратыўнага парадку, навучальных праграм [12, с. 37–38]. Аднак у рэшце рэшт далей абмеркаванняў праца не пайшла.

Тым не менш з мая – чэрвеня 1907 г. адзначалася паступовае памяншэнне грамадска-палітычнай дзейнасці вучнёўскай моладзі: гэта звязана са сканчэннем рэвалюцыі 1905–1907 гг. і зніжэннем актыўнасці палітычных партый і ўвогуле рэвалюцыйнага руху. У гэтых умовах у вучнёўскім руху на тэрыторыі беларускіх губерняў акадэмічныя патрабаванні і культурна-асветніцкая дзейнасць выходзяць на першае месца. Разам з тым у паменшаным, больш замаскіраваным выглядзе вучнёўская моладзь працягвала займацца і палітычнай дзейнасцю.

Улады, як і раней, адзначаючы памяншэнне грамадска-палітычнай дзейнасці навучэнцаў, звярталі ўвагу на зніжэнне іх маральна-этычных якасцей. Губернатар Мінскай губерні ў лісце да дырэктара Мінскай гімназіі С. В. Праабражэнскага ад 26 жніўня 1908 г. паведамляў, што «па звестках, якія дайшлі да Міністэрства ўнутраных спраў, сярод вучнёўскай моладзі абодвух палоў заўважаецца падчас апошніх двух-трох гадоў моцны заняпад маральнасці, што праяўляецца не толькі ў неналежных

паводзінах на вуліцах, але і ў публічных месцах, як напрыклад, у садах, скверах, на танцавальных вечарах, спектаклях, трэках і інш.». Прычыны гэтага ўлады бачылі, з аднаго боку, у слабасці або адсутнасці бацькоўскага аўтарытэту і пазашкольнага нагляду за навучэнцамі і вынікаючага адгэтуль вольнага жыцця вучняў і вучаніц, а з іншага – «у агульнай распушчанасці нораваў, якія з'яўляюцца вынікам нядаўна перажытага краінай рэвалюцыйнага перыяду» [14, арк. 115].

Разам з тым у многіх навучальных установах, як і ў ранейшыя часы, працягвалі існаваць вучнёўскія маладзёжныя гурткі, якія актыўна займаліся культурна-асветніцкай дзейнасцю, даследавалі гісторыю Беларусі. Напрыклад, такія гурткі існавалі ў Віцебску пры мясцовым настаўніцкім інстытуце, пры Віленскай сярэдняй хіміка-тэхнічнай школе. У Полацку ў 1910–1911 гг. існаваў гурток вучняў мясцовых школ. Плённа працаваў у Гродне ў 1909–1914 гг. гурток беларускай моладзі.

У 1910 г. на тэрыторыі беларускіх губерняў назіралася пэўнае ажыўленне маладзёжнага руху, якое ў першую чаргу было звязана з інтэнсіфікацыяй гэтых плыняў у Маскве і Пецярбургу. У гэты час сярод моладзі, акрамя шэрагу палітычных і акадэмічных патрабаванняў, падымаліся і пытанні абвастрэння палітычнага становішча ў Еўропе, магчымай вайны [14, с. 69]. Назіраўся пад'ём маладзёжнага руху і бліжэй да Першай сусветнай вайны, але ж узроўню 1905–1907 гг. ён не дасягнуў.

Такім чынам, вучнёўская моладзь у канцы XIX ст. – жніўні 1914 г. была адной з найбольш грамадска-палітычна актыўных частак насельніцтва беларускіх губерняў, яна была складанай, этнарэлігійна, маёмасна і сацыяльна дыферэнцыраванай групай. Найбольшай актыўнасцю з-за адсутнасці вышэйшых устаноў адукацыі адрозніваліся вучні сярэдніх навучальных устаноў – гімназій, семінарый, вучылішч.

Грамадска-палітычная актыўнасць вучнёўскай моладзі ў канцы XIX ст. – жніўні 1914 г. не была аднароднай. Так, у канцы XIX ст. – снежні 1904 г. адбывалася станаўленне і паступовае разгортванне вучнёўскага руху на тэрыторыі беларускіх губерняў. Падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг. назіраецца значны рост актыўнасці вучнёўскай моладзі: выступленні вучняў адбываліся амаль ва ўсіх навучальных установах. Яны прымалі ўдзел у дэманстрацыях, мітынгах, забастоўках, займаліся агітацыйна-прапагандысцкай дзейнасцю і інш.

Перыяд з чэрвеня 1907 па жнівень 1914 г. характарызаваўся скарачэннем грамадска-палітычнай дзейнасці навучэнцаў. Аднак яна цалкам не знікла. Замест палітычнай працы навучэнцы плённа займаліся культурна-асветніцкай: даследавалі культуру і гісторыю беларускага народа, праводзілі лекцыі, наладжвалі выдавецкую дзейнасць.

У рэвалюцыйнай дзейнасці вучнёўскай моладзі ўлады Расійскай імперыі бачылі небяспеку, таму імкнуліся паменшыць актыўнасць навучэнцаў, прымалі меры па барацьбе з вучнёўскім рухам, сярод якіх галоўнымі былі адлічэнне з устаноў адукацыі, забарона паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы, павелічэнне нагляду за вучнямі, забарона ўдзельнічаць у палітычных выступленнях (дэманстрацыях, мітынгах і інш.), спыненне адукацыйнага працэсу ў навучальных установах.

Тым не менш вучнёўскі рух адыгрываў значную ролю ў грамадска-палітычным жыцці беларускіх губерняў у канцы XIX – пачатку XX ст. Гэта прыводзіла да таго, што ўлады былі вымушаны пільна яго кантраляваць, а розныя палітычныя сілы – змагацца за яго.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. *Каханоўскі А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.). Мінск, 2013.
2. *Молотов А.* Молодежь и 1905 г. Харьков,1925.
3. Отчет о состоянии Виленской второй гимназии за 1896/97 учебный год. Вильна, 1897.
4. Участие в революционном движении учащихся средних школ и духовной семинарии г. Минска // Документы и материалы по истории Белоруссии (1900–1917 гг.). Минск, 1953. Т. 3.
5. Участие в забастовочном движении учащихся Минской губернии // Документы и материалы по истории Белоруссии (1900–1917 гг.). Минск, 1953. Т. 3.
6. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 466. Воп. 1. Спр. 70. Арк. 10.
7. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 466. Воп. 1. Спр. 70. Арк. 12.
8. Политическое выступление учащихся в Слуцкой гимназии // Документы и материалы по истории Белоруссии (1900–1917 гг.). Минск, 1953. Т. 3.
9. Политическое выступление учащихся в Бобруйской мужской гимназии // Документы и материалы по истории Белоруссии (1900–1917 гг.). Минск, 1953. Т. 3.
10. Тайная сходка учащихся учебных заведений г. Минска // Документы и материалы по истории Белоруссии (1900–1917 гг.). Минск, 1953. Т. 3.
11. *Киселев А. А.* Полиция белорусских губерний в период политического кризиса 1905–1907 гг. // Идеологические аспекты военной безопасности. 2010. № 3. С. 23–25.
12. *Ляхоўскі У.* Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.). Беласток, 2012.
13. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 466. Воп. 1. Спр. 70. Арк. 115.
14. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2554. Воп. 1. Спр. 881. Арк. 69.

Паступіў у рэдакцыю 08.06.2015.

***Вадзім Аляксандравіч Вярыга*** – аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта БДУ. Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта БДУ У. К. Коршук.